В номере:

Вышиванку – новорожденному



с.2

Как распознать лжегазовщика



с.5

Сюрприз от пограничников

с.6



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№50 (10868)

6 ліпеня 2019 года Субота

ПАСЛЯСЛОЎЕ ДА СВЯТА



# Шматгалосае рэха незалежнасці

**У летапіс працоўнай і воінскай славы беларусаў упісана 75-я старонка. Юбілейную дату вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў дабрушане адсвяткавалі ў лепшых традыцыях ушанавання памяці аб вызваліцелях.**

А пачаліся ўрачыстасці ў месяцы, якое ў раёне называюць сімвалам гераізму змагароў з захопнікамі. Каля мемарыяльнага комплексу "Памяць" сабраліся работнікі прадпрыемстваў і арганізацый, ваеннаслужачыя, праваахоўнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Сярод іх не было сведкаў тых страшных падзей. Іх месца заняла моладзь. Удзельнікі агульнарэспубліканскай акцыі "Беларусь памятае" – з партрэтамі сваіх дзядоў і прадзедаў у руках. 10 імёнаў знакамітых дабрушан – Герояў Савецкага Саюза, землякоў, якія нарадзіліся або доўгі час жылі на Добрушчыне, нанеслі на "Палатно памяці".

(Заканчэнне – на 7 с.)

Фота Яўгена УСЦІНАВА

## Весткі з месцаў

### 100-бальная вышыня

Максімальны вынік – 100 балаў па беларускай мове на цэнтралізаваным тэсціраванні атрымала выпускніца гарадской гімназіі Юлія Кісялёва. Аб гэтым паведамілі ў навучальнай установе. Зазначым, што па веды ў райцэнтр дзяўчынка ўвесь час навучання ездзіла з Насовічаў. Высокага рэзультату на ЦТ ёй дапамагла дасягнуць настаўніца беларускай мовы і літаратуры Святлана Грыневіч.

**Ганна КІРЫЕНКА**

### Справа для маладых

**27 маладых спецыялістаў, выпускнікоў ВНУ і сярэдніх медыцынскіх навучальных устаноў, накіраваны на працу ў наш раён.**

Як праінфармавалі ў цэнтральнай раённай бальніцы, у ліку маладых кадраў – 15 урачоў: агульнай практыкі, акушэр-гінеколагі, педыятр, анестэзіёлаг-рэаніматолаг і іншыя спецыялісты неўзабаве з'явяцца на працоўных месцах. З 1 жніўня да работы ў лячэбна-прафілактычных установах раёна прыступяць таксама 12 фельчараў, памочнікаў урача, медсясцёр і іншых сярэдніх медыцынскіх работнікаў.

**Людміла ФЁДАРАВА**

### На творчай ноце

**Члены літаратурна-паэтычнага клуба «Натхненне» паўдзельнічалі ў «Бэзавых вечарах», што ладзяцца цэнтральнай бібліятэкай імя Леніна ў Гомелі.**

Літаратурна-музычны праект, які спрые развіццю творчых магчымасцей, сабраў удзельнікаў у чацвёрты раз. Па чацвяргах таленавітыя музыканты, паэты збіраюцца, каб прадставіць свае лепшыя творы. Права адкрыць мерапрыемства арганізатары прадаставілі кіраўніку клуба Людміле Яськовай і паэту-барду Аляксею Скачкову.

Удалым было і іх нядаўняе выступленне на літаратурна-музычным вечары ў Старадубскай бібліятэцы на Браншчыне. Вечар раманса сабраў там творцаў з Клінцоў, Навазыбкава, Злынкі і Добруша.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

Читайте в следующем номере:

Дом, где воспитали чемпиона

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 16.55
Луна
6, 7 июля – в Деве,
8, 9 – в Весах



Первая четверть
9 июля

**7 июля**
НОЧЬЮ +13…+15
ДНЕМ +19…+21
Переменная облачность.
Возможен дождь.
Ветер ю.-западный 2-3 м/с.

**8 июля**
НОЧЬЮ +13…+14
ДНЕМ +17…+20
Переменная облачность.
Возможен дождь.
Ветер западный 2-4 м/с.

ПРИГРАНИЧЬЕ

# Братские объятия фестиваля

**С необычайным размахом в минувшую субботу в Брянске прошли торжества, посвященные 50-летию международного фестиваля «Славянское единство». Они совпали с проводимым в России Днем партизан и подпольщиков**




**В составе делегации Гомельской области, а ее возглавлял исполняющий обязанности председателя облисполкома Геннадий Соловей, была и руководитель Добрушского райисполкома Ольга Мохорева.**

По ее словам, в ходе грандиозного мероприятия устроители ярко и выразительно продемонстрировали: на брянской земле сильны традиции патриотизма. А память о нашем общем прошлом, в том числе и военном, здесь хранится с особым почтением, становясь фундаментом для лучшего будущего.

После встречи белорусской делегации с губернатором Брянской области Александром Богомазом состоялось возложение венков дружбы к Вечному огню у памятника воинам и партизанам на площади Брянска. Партизанское братство и славянский хоровод объединяли участников фестиваля и на главной площадке – мемориальном комплексе «Партизанская поляна», что в 15 километрах от областного центра. Здесь состоялся торжественный митинг «В единстве – сила!» с участием ветеранов войны, депутатов Госдумы, священнослужителей, почетных гостей. В их числе – Герой России, народный артист СССР Василий Лановой, Герой Советского Союза Иван Кашин, представители стран-участниц фестиваля. По традиции прозвучали гимны трех соседних славянских государств – России, Беларуси и Украины.

Примечательным и трогательным событием праздника стала церемония вручения четырем селам и поселкам Брянщины почетных званий «Населенный пункт партизанской славы». Грамоты о присвоении юнармейцы прямо с Партизанской поляны доставили по местам назначения.

Апогеем встречи стал праздничный концерт. Фестивальную программу украсили яркие номера заслуженного коллектива Беларуси цирка имени Абеля из Гомеля и арт-группы «Бульбаш» из Добруша.

**Николай ЖДАНОВИЧ**
**Фото «БрянскToday»**

НА СВЯЗИ

**8 июля с 10.00 до 12.00 по телефону 3-12-70**
пройдет прямая телефонная линия с участием Елены Владимировны СИЛИНОЙ, начальника финансового отдела райисполкома.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

## Память о сражавшихся в годы войны – часть национального самосознания белорусов

**Память о сражавшихся в годы Великой Отечественной войны – часть национального самосознания белорусов. Об этом Президент Беларуси Александр Лукашенко заявил на параде в честь 75-й годовщины освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков и Дня Независимости.**

«Ровно 75 лет назад здесь отгремели последние бои за столицу нашей Родины – город Минск. Это была победа над самой смертью. Это было торжество единства и силы духа великого поколения воинов-освободителей». Александр Лукашенко подчеркнул, что Беларусь торжественно отмечает главный государственный праздник – День Независимости. Этот день, отметил Президент, в далеком 1944 году вернул мир на истерзанную фашистской оккупацией землю, показал несокрушимую силу советского народа, белорусов, стоявших насмерть за свою свободу.

Из года в год 3 июля белорусский народ особенно остро воспринимает героические эпизоды Великой Отечественной войны, констатировал Александр Лукашенко. «Проживаем заново каждый факт, словно сами до последней капли крови обороняли Брестскую крепость, Буйничское поле, умирали в лагере смерти «Тростенец», в детском концлагере «Красный Берег», горели в Хатыни, форсировали Днепровский рубеж», – сказал Президент. Он напомнил, что Беларусь первой приняла на себя удар захватчиков, стала живым щитом на их пути, и ни пяди родной земли не было отдано без боя. Сопротивление началось с первых минут вторжения врага, но даже разрушенная и оккупированная Беларусь осталась непокоренной, обратил внимание Глава государства.

**По материалам БелТА**

АКЦЫІ

# У повязі з гісторыяй

**Вышыванкі вяртаюцца да беларусаў. Не толькі ў якасці бабуліных ручнікоў. Адзенне з арнаментам – і на модных подыумах, і ў гардэробах звычайных людзей. 2 ліпеня ў Добрушы прайшла традыцыйная акцыя з нагоды Дня вышыванкі.**

– Адметнасць маладзёжнага руху – у цеснай сувязі гісторыі і сучаснасці. Лепшае яго праяўленне – выкарыстанне нацыянальных арнаментаў. Нашы продкі лічылі іх абаронай ад няшчасцяў. З набору элементаў, кожны з якіх меў значэнне, стваралі абярэгі на ўсе выпадкі жыцця. Яны і цяпер прысутнічаюць у нашым асяроддзі. Гэта родная нам вышыванка, – адзначыла першы сакратар райкама БРСМ Таццяна Савельева.

Кашулю з нацыянальным арнаментам лідар маладзёжнага руху ўручыла самаму юнаму дабрушаніну Мікіце Малашанку. Акцыя "Падары немаўляці вышыванку" прайшла па ўсёй краіне. Адзенне з беларускім арнаментам атрымалі ўсе дзеці, народжаныя напярэдадні Дня Незалежнасці.

Больш за 20 работ прадставілі дабрушане на конкурс "Сэлфі і фота з вышыванкай". У раёне ён прайшоў у трэці раз. Пераважная большасць удзельнікаў прадстаўляла рабочую моладзь. Першае месца ў раённым этапе прысуджана арт-групе "Бульбаш".

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота прадастаўлена райкамам БРСМ**

